# АБ ЧЫМ РАСКАЗВАЮЦЬ УЗОРЫ

**Палякова Александрына Андрэеўна, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

У рабоце расказваеццапра адну з самых цікавых традыцый беларусаў – вышыванне ўзораў і значэнне сімвалаў вышывак. Народнае майстэрства ткацтва – адзін з самых папулярных відаўмастацтва. Мы прывычнаацэньваем рэчы з тканіны з пазіцыі прыгажосці, гармоніі колераў , іх прызначэння. Але народнае ткацтва –гэтаяшчэібяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак.

*Ключавыя словы: беларускія ўзоры; ткацтва; мастацтва; сэнс узораў; сімвалы.*

# ABOUT WHAT SPEAK PATTERNS

**PolyakovaAlexandrenaAndreevna, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor– senior lecturer Ratunskaya N. V.*

The paper describes about one of the most interesting traditions of the Belarusian-embroidery patterns and the meaning of the symbols of the embroidery. People's skillful weaving - one of the most popular types of art. We are accustomed to estimate things out of fabric from a position of beauty, harmony of colors, from the destination. But the folk weaving is a deep sourse of cultural-historical news.

*Keywords: вelarusian patterns; weaving; art; the meaning of patterns; symbols.*

Мэтай майго дакладу з’яўляецца азнаямленне аўдыторыі з адной з самых цікавых традыцый беларусаў – вышываннем узораў і значэннем сімвалаў вышыванак.

Народнае мастацкае ткацтва – адзін з найбольш папулярных і пашыраных відаў народнага мастацтва. Між тым яно яшчэ слаба вывучана. Мы звыкла ацэньваем тканыя рэчы з пазіцыі прыгажосці, адмысловасці, гармоніі каларыту. Але народнае ткацтва – яшчэ і бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор – то сімвал. Сімвалы ўраджаю: Спарыш, Рай, Багач. Яны вучаць любіць Маці-Зямлю, працу, дабівацца добрага ўраджаю. Сімвалы святаў: Купала, Каляда, Масленіца, Вялікдзень. Тут – радасць, весялосць, гонар



Репозиторий БГМУ

за вынікі сялянскай працы. Сімвалы памяці: Дзяды, Радаўніца – любоў і павага да продкаў. Усё, што захавана ў народным ткацтве, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека і яго працу, кожны ўзор мае сваё прызначэнне і сваю назву.

Узоры тканых і вышываных вырабаў – зашыфраваны аповед пра жыццё народа, прыроду, людзей, пра нашу гісторыю. Часам можа ўзнікнуць пытанне: што разумнае могуць сказаць цёмныя, непісьменныя сялянкі? І ўсё ж, не ў крыўду сучасным адукаваным жанчынам, колішнія непісьменныя жанчыны ў духоўных адносінах ім не саступалі. А што да еднасці з прыродай, тонкасці адчування навакольнага расліннага і жывёльнага свету, то нам да іх далёка.

Яркімі адметнымі рысамі арнаментаў Беларусі можна назваць пераважнае выкарыстанне розных геаметрычных фігур: квадрат; ромб; чатырохкутнік; палосы і іх дэталі. У некаторых выпадках вышываліся плыўныя перацяканні фігур у раслінныя матывы. Што характэрна для беларускіх узораў – гэта адсутнасць у іх сімвалаў смерці. Для беларусаў арнамент – гэта свайго роду абярэг, які павінен утрымліваць у сабе толькі станоўчае. Зразумела, патрэбы ў стварэнні абярэгаў з выявамі гора, смерці або болю не было.Нацыянальны арнамент Беларусі – гэта нязменны белы фон з чырвонымі малюнкамі на ім. Лічыцца, што толькі ў гэтым злучэнні колераў атрымалася захаваць нязменным першапачатковы выгляд узораў, якія існавалі яшчэ з часоў старажытнаславянскіх плямёнаў. Белы колер прызнана адлюстроўвае чысціню і адкрытасць, а вогненна-чырвоны- кроў, сонца і, адпаведна, жыццёвую сілу. Чорны колер пачалі ўжываць з канца пазамінулага стагоддзя, але ў малых колькасцях. Іншыя каляровыя гамы пры гэтым не выкарыстоўваліся.

Разнастайнасць форм знакаў абумоўлена шырокім асартыментам матываў, пераважных у народаў Беларусі: Геаметрычны матыў – самы папулярны выгляд. Уключае ў сябе кругі; зоркі; ромбы; кропкі; стужкі; лініі прамыя, ламаныя або зігзагападобныя; шасцікутнікі; крыжы. Раслінны матыў сустракаецца крыху радзей. Пераважна складаецца з кветак, асабліва акацыі і лотаса; лісця, пладоў, часцей за ўсё вінаграда. Анімалістычны матыў складаецца з малюнкаў, стылізаваных пад жывёл, або з дэталяў іх фігур.

Хочацца расказаць пра асноўныя сімвалы, якія ўжываюцца пры вышыванні.

Першы сімвал– зямля. Самы просты ўзор зямлі – ромб з промнямі ўнутр. Сімвал Зямлі-Карміцелькі як нівы, зямельнага надзелу ў народным ткацтве набыў выгляд ромбаз маленькіх квадрацікаў ці ромбікаў. Гэта нібы зярняткі, роўна засеяныя на полі дбайнай рукой селяніна. Усе народы ва ўсе часы ўспрымалі зямлю як аснову жыцця, карміцельку, а што ўжо казаць пра беларуса-земляроба! Народная прымаўка добра адлюстроўвае гэта: зямелька — матка наша, яна корміць,поіць і адзявае нас.

Другі сімвал, пра які я раскажу – сонца. Амаль усе ўзоры сонца нагадваюць ромб з адросткамі-промнямі. Ён можа спалучацца з іншымі ўзорамі, напрыклад, з узорам дажджу або зямлі,і тады гэта спалучэнне набывае новы сэнс. Спалучэнне з узорам дажджу »Вялікае Сонца».«Гэтым



Репозиторий БГМУ

узорам ткачыхі звяртаюцца да сонца, каб яно дало дождж і не паліла так моцна зямлю» (А. Баброва. Магілёўская вобласць).

Трэці сімвал – сімвал дажджу. Матывы з чатырох пялёсткаў, размешчаных ў цэнтры і па перыметры, майстрыхі называлі ўзорам дажджу. Вялікі крыжападобны ўзор з чатырох сегментных пялёсткаў называюць то Дожджыкам, то Дажджбогам. Хоць узор дажджу складаецца з аднолькавых элементаў, але ўсе яны маюць сваё прызначэнне. Адзін з іх павінен забяспечваць ураджай жыта на ніве, другі — сена на лузе, трэці — паўнаводнасць рэк, чацвёрты — добрую драўніну ў лесе.

Чацвёрты з асноўных сімвалаў азначае жыццё ці вясну. Скампанаваны гэты ўзор з дзвюх частак: ромб з адросткамі-прамянямі — Сонца, такі ж ромб, але прамяні накіраваны ўнутр, — Зямля. Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця, сімвал Сонца змяшчаецца ў сімвал Зямлі.

Гэта адзін з найстаражытных сімвалаў, у якім зашыфравана вялікая таямніца жыцця. Калісьці яго можна было бачыць у кожнай сялянскай хаце, паколькі ён лічыўся цудадзейным. Называюць яго па-рознаму: Жыццё, Вясна, Ярыла. «Вышываюць гэты ўзор, калі трэба прасіць Бога, каб ачуняў чалавек. А яшчэ калі ў бабы няма дзяцей.»(Е. Баргавінава).

Пяты сімвал– зорка, але ім абазначаюць яшчэ і чалавека. Узор «зорка» пакладзены ў аснову вобраза маці, чалавека, сімвала ўраджаю. Тым не менш, ёсць між імі пэўная розніца. Вобраз маці — гэта зорка, аблямаванаяпышным вянком і гірляндай з кветак, прычым аблямоўка можа быць квадратнай ці васьмівугольнай. Вобраз чалавека — таксама зорка, але яе чатырохвугольная аблямоўка значна прасцейшая, ланцужковая. Сімвал ураджаю — гэта ўжо не зорка, а разетка, скампанаваная з чатырох жытнёвых каласкоў, размешчаных пад прамым вуглом. Можа быць і аблямоўка, але не абавязкова. Зорка звязваецца з чалавекам у многіх народаў». Нарадзіўся чалавек, на небе з'явілася яго зорка. Добры чалавек, яго зорка гарыць ярка. Дрэнны — цьмяна. Памёр — яго зорка ўпала з неба на зямлю» (А. Сержпутоўскі).

Яшчэ адным з сімвалаў з’яўляецца Купалле. У народнай мастацкай творчасці вельмі любімы і пашыраны вобраз Купалінкі, якая ўяўляецца ці маладой вясёлай дзяўчынай, ці жанчынай з дзецьмі. Гэты паэтычны вобразчаста сустракаецца ў народным мастацкім ткацтве і вышыўцы. У купальскую ноч збіралі зёлкі, верачы ў іх магічную сілу, кляліся ў каханні да магілы, часам дамаўляліся пра вяселле. У поўнач самыя адважныя ішлі ў лясную гушчэчу шукаць папараць-кветку,пры гэтым марылі пра самае запаветнае. Адны — пра шчасце, добрага мужа, моцную сям'ю, другія — каб прываражыць хлопца,трэція — разбагацець.

Апошні сімвал, які з’яўляецца найбольш папулярным, гэта сімвал ураджаю Жыцень — мае выгляд разэткі ў выглядзе ромба, ад вуглоў якога адыходзяць па два стылізаваныя жытнія каласы. Ён нагадвае дажынкавы вянок, які сімвалізуе паспяховае заканчэнне жніва. Узор Спарыша мае выгляд разеткі з чатырох моцна стылізаваных каласкоў, вельмі падобных на зорку, — сімвал чалавека, таму іх няцяжка зблытаць. Розніца між імі ўсё ж ёсць: у Спарыша



Рэпазіторый БДПУ

лісты-каласы крышку аддаленыя ад цэнтральнай разэткі, а ў зоркі — цесна змыкаюцца ў цэнтры.

Такім чынам, мы можам зрабіць выснову, што беларускія ўзоры – самабытныя каларытныя элементы, унікальныя сваім старажытным паходжаннем, а таксама арыгінальным выглядам. Іх прымяненне не губляе папулярнасці з даўніх часоў і па сённяшні дзень. Нашэнне узораў стала асаблівым відам патрыятызму, праяўленага да сваёй краіны.